# ВЫКАРЫСТАННЕ МЕТАДУ СІТУАЦЫЙНАГА МАДЭЛЯВАННЯ Ў ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ МЕНЕДЖАРАЎ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ СФЕРЫ

# THE USAGE OF A SITUATIONAL MODELLING METHOD IN THE PROFESSIONAL EDUCATION OF MANAGERS IN THE SOCIOCULTURAL SPHERE

***Т.Д. Рабец***

***T.D. Rabec***

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, Беларусь
Belarusian State University of Culture and Arts, Minsk, Belarus
*e-mail: rabez72@mail.ru*

У артыкуле разглядаюцца асаблівасці прымянення метаду сітуацыйнага мадэлявання ў працэсе прафесійнай падрыхтоўкі менеджараў сацыякультурнай дзейнасці, вызначаюцца асноўныя прынцыпы выкарыстання дадзенага метаду ў вучэбна-адукацыйным працэсе, аналізуюцца асноўныя формы выкарыстання сітуацыйнага мадэлявання ў навучанні студэнтаў: сітуацыі-ілюстрацыі, сітуацыі-практыкаванні, сітуацыі-праблемы, ролевыя сітуацыйныя гульні.

The article presents the features of the usage of a situational modelling method in the professional education of managers in the sociocultural sphere. The author defines the main principles of the use of this method in the educational process, analyzes the main forms of using a situational modeling while teaching students: situations-illustrations, situations-exercises, situations-problems, situational role games.

*Ключавыя словы:* праблемнае навучанне; сітуацыйнае мадэляванне; кейс-метад; сітуацыі-ілюстрацыі;сітуацыі-практыкаванні; сітуацыі-праблемы; ролевыя сітуацыйныя гульні; менеджары сацыякультурнай сферы.

*Keywords:* problem-solving education; situational modeling; case method; situations-illustrations; situations-exercises; situations-problems; situational role games; managers of the sociocultural sphere.

Сучаснае грамадства зацікаўлена ў тым, каб кожны чалавек увесь час набываў новыя веды, удасканальваў сваё прафесійнае майстэрства, клапаціўся пра рост сваёй кваліфікацыі, агульнай культуры, без чаго яму цяжка адаптоўвацца ў хутказмяняльных умовах сучаснага жыцця. І менавіта ў сацыякультурнай сферы сёння, як ніколі раней, патрабуюцца спецыялісты-менеджары, якія павінны быць прафесійна эрудыяванымі і мэтанакіраванымі, здольнымі хутка адаптоўвацца да ўмоў прафесійнай дзейнасці, якія вельмі хутка змяняюцца і ўскладняюцца.

На вырашэнне гэтай задачы і накіравана дзейнасць сучасных устаноў адукацыі, якія закліканы дапамагаць маладому пакаленню не

толькі спазнаць і крытычна перапрацаваць вопыт папярэдніх пакаленняў, але і навучыць яго арыентавацца ў нестандартных сітуацыях, валодаць прынцыпова новай тэхналагічнай культурай, быць прафесійна і псіхалагічна падрыхтаваным да жыцця і сваёй працоўнай дзенасці, а таксама спрыяць фарміраванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі асобы, яе імкненню ўдзельнічаць у кіраванні справамі дзяржавы, грамадства і працоўнага калектыва.

Сёння становіцца відавочным, што для таго, каб адукацыя адказвала патрабаванням цяперашняга этапу развіцця грамадства, яна не можа развівацца і функцыянаваць па ранейшых застылых канонах. Старая педагагічная парадыгма мае патрэбу ў кардынальным пераглядзе, і ў прыватнасці, гэта датычыцца не толькі яе метадалагічнай і канцэптуальнай асновы, якая вызначае шляхі развіцця педагагічнай думкі, але і метадаў і спосабаў навучання.

Паспяхова навучаць студэнтаў эфектыўным спосабам засваення ведаў у сучасных умовах магчыма, як нам уяўляецца, праз пераход да калектыўных і інтэнсіўных спосабаў навучання і, у прыватнасці, за кошт укаранення ў адукацыйную практыку праблемна-сітуатыўнага навучання і блізкіх па тыпе арганізацыі і ўздзеяння на студэнтаў актыўных метадаў навучання.

Вопыт нашай педагагічнай практыкі дае падставы меркаваць, што ўкараненне ў навучальны працэс сітуацыйнага мадэлявання – метаду, які дазваляе скараціць шлях паўторнага «адкрыцця» ўжо вядомых варыянтаў рашэння праблемы, – спрыяе фарміраванню ў студэнтаў механізму параўноўвання ўзнікаючых сітуацый з тыпавымі.

Сітуацыйны падыход у дыдактыцы можна разглядаць як адну з разнавіднасцяў праблемнага навучання, сутнасць якога заключаецца ў выпрацоўцы ў студэнтаў прыёмаў самастойнага даследавання і вырашэнні пастаўленых нетыповых задач, а таксама ў тым, што дзейнасць выкладчыка прадугледжвае тлумачэнне зместу найбольш складаных паняццяў, сістэматычнае стварэнне праблемных сітуацый, паведамленне студэнтам фактаў і арганізацыю іх навучальна-пазнавальнай дзейнасці такім чынам, каб на аснове аналізу фактаў студэнты самастойна зрабілі высновы і абагульненні. У выніку ў студэнтаў выпрацоўваюцца навыкі разумовых аперацый і дзеянняў, а таксама навыкі пераносу ведаў у рэальную практыку.

Аналіз дыдактычных аспектаў сітуацыйнага мадэлявання дазваляе вылучыць два асноўных кірункі яго выкарыстання:

1) выпрацоўку ў студэнтаў навыкаў сітуацыйнага падыходу да аналізу пэўнай дзейнасці (г.зн. навучанне сітуацыйнаму мадэляванню);

2) ужыванне сітуацыйнага мадэлявання як метаду навучання (г.зн. навучанне пасродкам гэтага метаду).

Свядома пастаўленая задача сітуацыйнага мадэлявання адводзіць спажыўца мадэлі (кіраўніка прадпрыемства або арганізацыі) у «віртуальную рэальнасць»: напрыклад, студэнтам прапануецца прайграць сітуацыі, калі «мы павялічым ці знізім кошт на паслугі у два разы» або калі «ўзнікнуць праблемы з адсутнасцю неабходнага для ажыццяўлення дзейнасці арганізацыі абсталявання або кваліфікаванага персанала» і г.д.

Можна вылучыць некалькі асноўных прынцыпаў метаду сітуацыйнага мадэлявання, якія адрозніваць дадзены метад ад іншых разнавіднасцяў праблемнага навучання:

– метад прызначаны для атрымання ведаў па дысцыплінах, тэмах,ісціна якіх далёка неадназначная;

– падчас супрацоўніцтва выкадчыка і студэнта, намаганні апошняга накіраваны не на авалоданне гатовымі ведамі, а на яго самастойную выпрацоўку;

– вынікам такой дзейнасці з'яўляецца не толькі атрыманне ведаў, але і фарміраванне навыкаў даследчый працы, якія, несумненна, будуць запатрабаваны ў іх будучай прафесійнай дзейнасці.

У абагульненым выглядзе ў працэсе выкарыстання метада сітуацыйнага мадэлявання ў вучэбна-адукацыйнай практыцы можна вылучыць некалькі этапаў:

1. апісанне рэальнай праблемнай сітуацыі;
2. альтэрнатыўнасць рашэння праблемнай сітуацыі;
3. адзіная мэта і калектыўная праца па выпрацоўцы рашэння;
4. функцыянаванне сістэмы групавога ацэньвання прынятых рашэнняў;
5. эмацыйная напруга студэнтаў.

Трэба узгадаць, што сітуацыйную методыку навучання часта называюць кейс-метадам, які прадугледжвае падбор адпаведнага рэальнага матэрыялу, у якім мадэлюецца праблемная сітуацыя і адлюстроўваецца комплекс ведаў, уменняў і навыкаў, якімі студэнтам неабходна авалодаць у працэсе засваення вучэбнай дысцыпліны. Кейсы, звычайна падрыхтаваныя ў пісьмовай форме, чытаюцца, вывучаюцца і абмяркоўваюцца. Матэрыял кейсаў складае аснову гутаркі студэнтаў пад кіраўніцтвам выкладчыка. Пры гэтым роля выкладчыка заключаецца ў напраўленні кірунку гутаркі ці дыскусіі з дапамогай праблемных пытанняў, у кантролі часу працы, у заахвочванні студэнтаў адмовіцца ад павярхоўнага мыслення, ва ўцягванні ўсіх членаў групы ў працэс аналізу кейса.

Варта адзначыць, што распрацоўка кейса патрабуе ад выкадчыка эрудыцыі, педагагічнага майстэрства і часу і з'яўляецца вельмі складанай, але ў той жа час і вельмі эфектыўнай задачай для любога выкладчыка.

Сітуацыйнае мадэляванне як метад навучання можа выкарыстоўвацца як у лекцыйных, так і ў актыўных формах навучання. Найбольш цікавымі формы выкарыстання сітуацыйнага мадэлявання ў навучанні з'яўляюцца сітуацыі-ілюстрацыі, сітуацыі-практыкаванні, сітуацыі-праблемы, ролевыя сітуацыйныя гульні.

Сітуацыі-ілюстрацыі могуць быць вельмі эфектыўна скарыстаны падчас выкладання лекцыйнага матэрыялу з мэтай тлумачэння асобных тэарэтычных пытанняў. Напрыклад, пры выкладанні курса «Бізнэс-адміністраванне» для студэнтаў спецыялізацый «мэнэджмент рэкламы і грамадскіх сувязей» і «мэнэджмент міжнародных культурных сувязей» [1] у якасці ілюстрацый могуць выкарыстоўвацца мадэлі арганізацыйных структур кіравання арганізацыяй. З іх дапамогай ёсць магчымасць паказаць асаблівасці праектавання арганізацыйнай структуры ў залежнасці ад іерархіі ўзроўняў кіравання і маштаба кіравальнасці арганізацыяй або праілюстраваць правільнае вырашэнне складанай сітуацыі, якая можа ўзнікнуць у выніку няправільнага выбару арганізацыйнай структуры пры стварэнні новай арганізацыі. І менавіта тэхналогіі сітуацыйнага мадэлявання прызначаны забяспечваюць поўны цыкл падтрымкі прыняцця рашэнняў – ад арганізацыі збору інфармацыі, яе апрацоўкі і аналізу, прагназавання тэндэнцый развіцця становішча і да выпрацоўкі рэкамендацый па вызначэнні стратэгіі пэўных дзеянняў кіраўніка або далейшага развіцця ўсёй арганізацыі ў цэлым.

Выкарыстанне ў дыдактычных мэтах метаду сітуацыі-адзнакі зводзіцца да таго, што на занятках выкладчык апісвае студэнтам пэўную рэальную сітуацыю, якая можа ўзнікнуць у працэсе ажыццяўлення самастойнай прадпрымальніцкай дзейнасці, і прапаноўвае некалькі шляхоў вырашэння дадзенай сітуацыі. Студэнты павінны ацаніць прапанаваныя рашэнні, паспрабаваць знайсці магчыма дапушчаныя памылкі дзеянняў прадпрымальніка, растлумачыць іх сутнасць і пры гэтым абгрунтаваць свае высновы. Напрыклад, студэнтам прапануецца выбраць і абгрунтаваць правільнасць выбару пэўнай сістэмы падаткаабкладання ў залежнасці ад памеру арганізацыі, абранай арганізацыйна-прававаой формай прадпрыемства і памеру прыбытку арганізацыі за 9 месяцаў.

Выкарыстанне сітуацыі-практыкавання прадугледжвае тое, што выкладчык абмяжоўваецца выкладам сутнасці праблемнай сітуацыі і прапануе студэнтам прааналізаваць гэту сітуацыю, правесці яе

дыягностыку, паспрабаваць на аснове яе аналізу выпрацаваць адпаведнае правільнае вырашэнне. Пры гэтым улічваецца тое, што ў задачах амаль ніколі не ўтрымоўваецца поўных дастатковых дадзеных для правільнага іх вырашэння. Студэнтам даводзіцца самастойна шукаць усе звесткі, якія адсутнічаюць, у выпадку ж немагчымасці гэтага – знайсці іншы варыянт вырашэння праблемы. Менавіта таму задачы, прапанаваныя студэнтам для рашэння, павінны ўтрымоўваць загадзя няпоўны пералік зыходных дадзеных. Напрыклад, студэнтам прапаноўваецца падабраць супрацоўніка на вакантную пасаду менеджара кампаніі, вызначыць кампетэнцыі, якімі павінен валодаць будучы супрацоўнік, падабраць найбольш эфектыўныя метады падбору персанала, падрыхтаваць пытанні для анкетавання і правядзення гутаркі з прэтэндэнтам на дадзеную пасаду.

Сітуацыйная ролевая гульня – гэта адмыслова арганізаванае спаборніцтва ў рашэнні камунікатыўных задач паміж удзельнікамі, якія выконваюць строга зададзеныя ролі ва ўмовах выдуманай сітуацыі, загадзя падрыхтаваных заданняў. Сітуацыйная ролевая гульня з'яўляецца выпрабаваннем студэнтаў на самастойнасць і знаходлівасць, бо кожнаму ўдзельніку даводзіцца не раз падчас гульні рэагаваць на камунікатыўныя ўчынкі іншых удзельнікаў.

Сітуацыйныя навучальныя задачы могуць вырашацца або індывідуальна, або калектыўна па 3-5 чалавек. Пасля выканання заданняў праводзіцца калектыўнае абмеркаванне ходу і выніку працы. Магчыма таксама папярэдняе ўзаемнае рэцэнзаванне распрацаваных варыянтаў, а таксама публічная абарона розных рашэнняў адной і той жа сітуацыйнай задачы. Істотнай умовай правільнага ходу рашэння сітуацыйных задач служыць тэарэтычнае абгрунтаванне кожнага дзеяння. Напрыклад, студэнты групы дзеляцца на тры каманды. Кожная каманда атрымоўвае фінансавую справаздачу арганізацыі і прапаноўваецца правесці рэвізію з мэтай выяўлення памылак ў ажыццяўленні гаспадарчай дзейнасці арганізацыі, прыняцця калектыўнага рашэння па іх выпраўленню і выпрацоўцы стратэгіі далейшай эфектыўнай працы арганізацыі.

Такім чынам, тэхналогіі сітуатыўнага мадэлявання, як ніякія іншыя, патрабуюць ад выкладчыка значных выдаткаў сіл і часу. Пры гэтым ад педагога патрабуецца рэалізацыі творчых сіл і арганізатарскіх здольнасцей. Аднак менавіта гэтыя тэхналогіі ўспрымаюцца студэнтамі з адмысловай цікавасцю і з’яўляюцца найбольш эфектыўнымі ў плане засваення пэўных прафесійных кампетэнцый будучымі спецыялістамі ў сферы менеджменту сацыякультурнай дзейнасці.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Бизнес-администрирование: уч.-метод. комплекс по уч. дисциплине для спец-ти 1-21 спец-ти 1-21 04 02 Культурология (прикладная), специализаций 1-21 04 03 Менеджмент международных культурных связей, 1-21 04 01 Культурология (по направлениям), направления 04 03 Менеджмент рекламы и общественных связей // БГУКИ, Ф-т культурологии и социокультурной деятельности, кафедра межкультурных коммуникаций. – Минск, 2017. – 80 с.

# ВОЗМОЖНОСТИ КОНТЕКСТНОГО ОБУЧЕНИЯ В РЕШЕНИИ ПРОБЛЕМ ПРОФЕССИОНАЛЬНОГО СТАНОВЛЕНИЯ НА ПРИМЕРЕ ДИСЦИПЛИНЫ «ТРУДОВОЕ ПРАВО»

# POSSIBILITIES OF CONTEXT TRAINING IN SOLVING PROBLEMS OF PROFESSIONAL FORMATION ON THE EXAMPLE OF ‘LABOUR LAW’ DISCIPLINE

***В.Р. Сагитова[1], И.Ф. Назмиева[2]***

***V.R. Sagitova[1], I.F. Nazmieva[2]***

Казанский (Приволжский) федеральный университет
Казань, Российская Федерация,
Kazan Federal University, Kazan, Russian Federation
*e-mail: [1]12612682@mail.ru, [2]nazmievaindira95@mail.ru*

В статье поднимается вопрос возможностей контекстного обучения в решении проблем профессионального становления студента при освоении юридических дисциплин. Конфликты и кризисы профессионального самоопределения студентов тесно переплетаются с противоречиями образовательного процесса и отражаются на мотивации к обучению работе по специальности после окончания обучения в вузе. Контекстное обучение в преподавании юридических дисциплин представляет собой квазипрофессиональную деятельность, объединяющую в себе как учебную, так и будущую профессиональную деятельность, что обеспечивает не только быстрое усвоение материала, но и формирование образа профессионала.

The article raises the question of the possibilities of contextual learning in solving problems of professional development of students studying legal disciplines. Conflicts and crises of professional self-determination of students are closely intertwined with the contradictions of the educational process and affect the motivation to learn to work in their field of studies after graduating. Contextual learning in the teaching of legal disciplines is a quasi-professional activity that combines both educational and future professional activities, which provides not only rapid assimilation of the material, but also the formation of the image of a professional.